# Журналістыка

*Н.В. НАРЫНКЕВІЧ*

## БЕЛАРУСКАЯ ПУБЛІЦЫСТЫКА ПЕРЫЯДУ ПЕРАБУДОВЫ (ДРУГАЯ ПАЛОВА 1980-х - СЯРЭДЗІНА 1990-х гг.)

Показываются закономерности развития отечественной публицистики периода перестройки; обосновывается ее влияние на демократические перемены; отражаются внутренние противоречия журналистики 1970-1990-х гг.

There is a presentation of the main regularities in the development of national social journalism of perestroika period, a depiction of influence of publicistic thought on democratic changes in society and inner contradictions of social journalism itself of 1970-1990s.

Зварот да публіцыстычных жанраў абумоўлены актыўнай грамадзянскай пазіцыяй аўтара, які імкнецца праз канкрэтнага чалавека або з'яву паказаць тыповыя прыкметы эпохі, выявіць да іх свае адносіны і такім чынам паўплываць на станаўленне і развіццё грамадскай думкі. Вопыт папярэднікаў дапамагае асэнсоўваць праблемы сваёй эпохі. Публіцыстыка, якая адлюстроўвае праблемы і супярэчнасці сучаснасці з высокіх маральна-духоўных і грамадзянскіх пазіцый, застаецца актуальнай і ў наступныя гады.

Беларуская публіцыстыка перыяду перабудовы (другая палова 1980-х - сярэдзіна 1990-х гг.) амаль не даследавалася айчыннымі крытыкамі. Аднак менавіта гэты часавы адрэзак - адзін з найбольш важных у яе развіцці. Дэмакратычныя змены ў савецкім грамадстве рыхтаваліся і адбываліся пад уплывам не толькі эканамічных, палітычных, сацыяльных фактараў. У гэты перыяд публіцысты, нарэшце, змаглі пісаць пра набалелае і тым самым не толькі ўздымалі шматлікія грамадска-палітычныя, эканамічныя, духоўныя праблемы, але і рыхтавалі глебу для іх вырашэння. Пісьменнікі першымі ўголас загаварылі на забароненыя раней тэмы: сталінскія рэпрэсіі, афганская вайна, экалагічныя праблемы, пытанні рэлігіі, пагроза ядзернай вайны. Без перабольшвання можна сцвярджаць, што менавіта публіцыстыка, як і мастацкая літаратура, шмат у чым спрыяла ўздыму дэмакратычнага руху ў Савецкім Саюзе, рыхтавала перамены, якія адбыліся ў сярэдзіне 1980-х гг., набліжала абвяшчэнне галоснасці ў краіне і ўплывала на вырашэнне пытанняў, звязаных з нацыянальным адраджэннем Беларусі. Палемічныя, вострыя матэрыялы А. Казловіча, С. Апексіевіч, А. Адамовіча, В. Быкава закранালі галоўныя праблемы тагачаснай рэчаіснасці, аўтары шукалі новыя стылёвыя і жанравыя падыходы для раскрыцця спрэчных пытанняў. Тэмы, якія закраналіся ў публіцыстыцы і раней (праблемы міграцыі сельскіх жыхароў у горад, неперспектыўных вёсак і інш.), набывалі новае гучанне, разглядаліся ў рэчышчы складанага сацыяльна-палітычнага кантэксту эпохі.

Нельга сцвярджаць, што ў самой публіцыстыцы гэтага перыяду не існавала супярэчнасцей. Журналісты і пісьменнікі не заўсёды своечасова і плённа рэагавалі на змены ў грамадскім жыцці. Першы пленум праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, які быў прысвечаны публіцыстыцы, адбыўся ў 1982 г. Адной з галоўных умоў непрэстыжнасці публіцыстыкі называлася няўвага да яе крытыкаў. Сярод аўтараў, якія сур'ёзна і з пастаяннай увагай даследавалі нарысы і іншыя

мастацка-публіцыстычныя жанры, можна адзначыць толькі А. Лысенка і У. Юрэвіча. Праблемай з'яўлялася і пастаянная затрымка выдання публіцыстычных кніг: напісанне грунтоўнага артыкула патрабавала шмат часу, а потым рукапіс мог праляжаць яшчэ гады два - тры, саступаючы месца творам мастацкай літаратуры. У выніку, калі кніга з'яўлялася, праблемы, якія аналізаваў публіцыст, нярэдка ўжо страчвалі актуальнасць. Перашкаджалі пастаноўцы і раскрыццю некаторых вострых, балючых тэм бюракратыя, кансерватызм чыноўнікаў і адказных асоб, немагчымасць абнародаваць былыя "сакрэтныя" дакументы.

Аднак уплывовасць і палымянасць публіцыстычнага слова ў разглядаемы перыяд была як ніколі важнай і патрэбнай. Аб гэтым нарысісты У. Глушакоў, В. Якавенка, А. Казловіч, крытык А. Лысенка разважалі на старонках газеты "Літаратура і мастацтва", якая давала магчымасць аператыўна выказаць свае думкі наконт сучаснага стану і далейшага развіцця публіцыстыкі яе аўтарам.

Канец 1970-х - пачатак 1980-х гг. характарызуецца ўсплёскам грамадскай актыўнасці, што адлюстравалася перш за ўсё ў дакументальнай літаратуры. Тагачасная беларуская публіцыстыка прадстаўлена не толькі кнігамі твораў асобных аўтараў, але і публіцыстычнымі серыямі, якія выдаваліся ў Беларусі менавіта напярэдадні і падчас перыяду перабудовы. Гэта перш за ўсё альманах "Сучаснік", серыі "Рэспубліка. Час. Людзі" і "Плошча Свабоды". Названыя выданні аб'ядноўвалі лепшыя публіцыстычныя матэрыялы таго часу, спрыялі калі не канчатковаму вырашэнню, то раскрыццю прычын цэлага шэрага сацыяльных, экалагічных, культурных праблем у грамадстве, сярод якіх варта звярнуць увагу на чернобыльскую катастрофу, пытанні нацыянальнага суверэнітэту і культурнага адраджэння. Творы, якія друкаваліся ў названых серыях, характарызаваліся палемічнасцю, адкрытасцю, акрэсленасцю аўтарскай пазіцыі. Па іх можна прасачыць дынаміку не толькі тагачаснай беларускай публіцыстыкі, але і грамадства ў цэлым. Менавіта публіцысты А. Адамовіч, Б. Сачанка, В. Якавенка, І. Новікаў першымі на старонках друку загаварылі пра наступствы атамнай катастрофы для Беларусі, пісьменнікі В. Быкаў, Н. Гілевіч, А. Петрашкевіч, С. Грахоўскі прыцягвалі ўвагу грамадства да праблем захавання беларускай мовы і культурнай спадчыны, упершыню звярталіся да тэмы сталінскіх рэпрэсій. С. Апексіевіч, А. Казловіч і іншыя аналізавалі эканамічныя эксперыменты вёскі 1980-х гг.

Першы выпуск штогадовага альманаха "Сучаснік" пабачыў свет у 1977 г. Напачатку гэта былі кнігі публіцыстыкі, дзе змяшчаліся творы, лепшыя з надрукаваных у перыёдыцы, прычым у "Сучасніку" канца 1970-х гг. сярод іх больш было нарысаў-партрэтаў, героямі якіх станавіліся перадавікі вытворчасці або сельскай гаспадаркі, камуністы. З цягам часу "Сучаснік" станавіўся больш падобным на кніжны варыянт часопіса, у якім друкавалася толькі публіцыстыка, што, несумненна, прыцягвала да яго ўвагу. Адной з вядучых тэм пачатку 1980-х гг. у альманаху становіцца тэма вайны і міру, пагроза тэрмаядзернай катастрофы на планеце, якая развіваецца ў агульнафіласофскую ідэю жыцця і смерці (творы С. Паўлава, Б. Сачанкі, А. Адамовіча).

Альманах становіцца больш праблемным і тэматычна разнастайным з 1985 г. "Сучаснік" піша ўжо не толькі пра "герояў нашага часу", часцей звяртаецца да маральна-этычнай праблематыкі. Артыкулы і нарысы на тэмы выхавання моладзі, школьнай рэформы, сацыяльнага сіроцтва і дзіцячых дамоў з'яўляюцца амаль у кожным нумары альманаха. Упершыню публіцысты ўголас загаварылі на тэмы, якія замоўчваліся ў друку ў папярэднія гады: захаванне сям'і і разводы, пазбаўленне бацькоўскіх правоў, алкагалізм і наркаманія.

Шмат увагі "Сучаснік" надаваў эканамічным эксперыментам, якія пачалі адбывацца ў рэспубліцы ў выніку рашэнняў XXVII з'езда КПСС. З'явіліся публікацыі, якія наўрад ці маглі б пабачыць свет раней, напрыклад, нарыс В. Мысліўца "Школа гаспадарання", прысвечаны пераходу на брыгадную форму працы завода, У. Кажэўнікава "Цана прэстыжу" (расследаванне пра вытворчасць дрэннаякасных тэлевізараў "Гарызонт"), В. Жука "Іншароднае цела" (будаўніцтва аўстрыйцамі Беларускага металургічнага завода ў Жлобіне). Публікацыі насычаюцца тэрмінамі і азначэннямі, якія адлюстроўваюць невядомыя раней з'явы і

працэсы рэчаіснасці: камерцыя, акцыянер, дадатковыя даходы, самаакупнасць прадпрыемства і інш.

Упершыню ў беларускай публіцыстыцы Я. Будзінас акцэнтаваў увагу не на вопыце перадавых гаспадарак, а на праблемах адстаючых калгасаў, эканамічна слабых саўгасаў (нарыс "Як памагчы слабому?"). Менавіта на гэтую асаблівасць беларускай публіцыстыкі - фактычную адсутнасць твораў пра негатыўныя з'явы, глыбіні мастацкага і сацыяльнага аналізу рэчаіснасці, завостранасці і канструктыўнасці ў вывадах, перавагу станоўчай тэмы ў нарысістыцы - звяртаў увагу на Пленуме СП БССР па праблемах публіцыстыкі ў 1982 г. І. Дуброўскі.

Сярод твораў, прысвечаных жыццю беларускай вёскі 1980-х гг., у серыі "Рэспубліка. Час. Людзі" адзначым кнігу падарожных эсэ В. Якавенкі "Вясковыя дыспуты" (1987), якая з'явілася вынікам яго паездак з рускім публіцыстам І. Васільевым па калгасах і саўгасах рэспублікі на пачатку перабудовы. На думку аўтара, важна пераадолець інерцыю мыслення ў падыходах да кіраўніцтва калгасамі, знішчыць планава-гаспадарчы вандалізм асобных чыноўнікаў, толькі ў гэтым выпадку магчымыя карэнныя змены ў сялянскім асяроддзі. Ён настойваў таксама на неабходнасці экалагічнага падыходу да гаспадарчых спраў. В. Якавенка даследуе "вялікі сялянскі Акіян", звяртаючы ўвагу на цэлы комплекс праблем і скпаданасцей жыцця сучаснай вёскі. Сярод іх - адчужэнне селяніна ад зямлі, інфантыльнасць моладзі і яе адасобленасць ад працы, міграцыя вясковых жыхароў у горад, мяшчанства, урбанізацыя самой вёскі. Звяртаецца аўтар і да праблемы культурна-асветніцкай працы на сяле і стварэння ўласна вясковай эстэтыкі і культуры (прынамсі, пры будаўніцтве жыллёвых і культурных аб'ектаў). Шмат увагі ў сваіх разважаннях аўтар надае вопыту перадавога калгаса "Рассвет" і яго кіраўнікоў К. Арлоўскага і В. Старавойтава (Якавенка, 1987).

Разам з тым, аналізуючы зборнікі "Сучаснік" і кнігі асобных публіцыстаў з серыі "Рэспубліка. Час. Людзі", ужо ў сярэдзіне 1980-х гг. крытыкі адзначалі, што аўтары абмяжоўваюцца традыцыйна вядомай і распрацаванай вясковай тэматыкай, не з'яўляецца твораў, звязаных з новымі ўмовамі вытворчасці і быту, прысвечаных вопыту даследчыкаў у розных галінах дзейнасці. Так, у аглядзе кніг серыі "Рэспубліка. Час. Людзі" прафесар Б. Стральцоў звяртаў увагу аўтараў на малую колькасць нарысаў аб праблемах горада і рабочага класа (Стральцоў, 1981); пра недахопы матэрыялаў вытворчайтэматыкі пісала А. Лысенка ў артыкуле "На хвалі сучаснасці" (Лысенка, 1977); з праблемы тэматычнай вузкасці беларускай публіцыстыкі пачынаў свой даклад на пленуме 1982 г. старшыня праўлення СП БССР М. Танк: «Школу "вясковага" нарыса прайшлі многія. Але занядбанай выглядае ў публіцыстыцы справа адлюстравання горада. Амаль некранутым ляжыць у нас пласт маральных праблем, асабліва тых, што звернуты да юнацтва і дзяцей. Ды і ў барацьбе савецкіх народаў за мір пісьменнікі маглі б пісаць яскрава, глыбей раскрыць этычныя каштоўнасці сацыялізму...» (Пярэдні край, 1982).

Пачынаецца шырокае абмеркаванне ў друку праблем экалогіі. Калі раней публіцысты звярталі ўвагу перш за ўсё на станоўчыя эканамічныя вынікі з'яўлення новых прадпрыемстваў у рэспубліцы, эфектыўнасць меліярацыйных работ на Палессі, то зараз пафаснасць твораў змяняецца глыбокім асэнсаваннем сувязей экалогіі і эканомікі, пагрозы прыроднаму асяроддзю Беларусі. Я. Лецка ў нарысе "Плыві, рачулка, вечна!" параўноўвае экалогію прыроды і "экалогію" душы, сцвярджаючы іх узаемазалежнасць, неабходнасць выхавання моладзі на традыцыях народнай спадчыны і культуры, назапашаных беларускім народам. Уздымаючы такія аспекты глабальнай праблемы, як браканьерства, атручванне рэк прамысловымі адходамі, аўтар адзначае ўплыў экалагічных страт на псіхіку мясцовых жыхароў.

Аналізуючы нарысы, прысвечаныя праблемам аховы прыроды, І. Дуброўскі ў пэўнай ступені асуджаў пацыфісцкае стаўленне да яе - «ахоўваць прыроду - значыць не кранаць яе. Наша дзяржава робіць шмат для захавання ў чысціні прыроднага асяроддзя. Але сёння страшнейшай пагрозай прыродзе выступав не прамысловасць з яе шкоднымі адыходамі, а цывілізаваны абывацель» (Дуброўскі, 1977). У сярэдзіне 1980-х гг. такая пазіцыя змяняецца агульнаграмадскім

асэнсаваннем неабходнасці дзяржаўных дзеянняў па захаванні экалагічнай раўнавагі. Асаблівай стала адказнасць кіраўніцтва пасля чарнобыльскай катастрофы.

Тэма Чарнобыля напрыканцы 1980-х толькі пачала з'яўляцца на старонках друку. Слушнымі былі крытычныя заўвагі А. Лысенка на пачатку 1989 г. у "ЛІМе": «Экалагічная тэма, напэўна, як ніводная іншая, выявіла сілу і слабасць галоснасці, дакпадней, яе недастатковасць. За тры гады на Беларусі не прагучалі на ўсю моц званы Чарнобыля. Не адгукнуліся яны і на старонках "Сучасніка"» (Лысенка, 1989). Адзіны матэрыял на гэтую тэму, які надрукаваў "Сучаснік-89", - успаміны старшыні Міжнароднай арганізацыі перасадкі касцявога мозгу, доктара-анколага Р.П. Гейла "Апошняе папярэджанне". У творы намаляваны маштаб катастрофы і зроблены прагноз яе наступстваў для так званага "чалавечага фактара", у аварыі адкрыта абвінавачваецца кіраўніцтва АЭС.

Да ліку закрытых раней тэм, што не падлягалі абмеркаванню ў друку, належала і праблема нацыянальнага самавызначэння рэспублік, якія ўваходзілі ў склад Савецкага Саюза. Рубрыка "Памяць" закранала пытанні беларускага адраджэння (гістарычнага і культурнага). Актыўным яе аўтарам стаў В. Быкаў, які разважаў над неабходнасцю выкрыцця "белых плямаў" гісторыі, захавання і развіцця беларускай мовы не толькі сярод інтэлігенцыі, але ў грамадстве ў цэлым, адзначаў цікавасць моладзі да тэмы сталінскіх рэпрэсій і заклікаў да адказу катаў перад народам.

Зборнікі публіцыстычнай серыі "Плошча Свабоды", якая з'явілася ў 1991 г., аб'яднаны тэмай духоўнага адраджэння Беларусі, асвятляюць праблемы станаўлення дзяржаўнай незалежнасці і пазбаўлення нацыянальнага нігілізму, а таксама шанавання культурнай спадчыны і роднай мовы. Вельмі сугучныя па свайму агульнаму настрою кнігі Н. Гілевіча "Выбар" (1993) і В. Быкава "На крыжах" (1992).

На пачатку 1990-х гг. артыкулы Н. Гілевіча становяцца больш палемічнымі ў параўнанні з творамі савецкага часу. Аўтар непахісны ў сцвярджэнні адзінага магчымага шляху для Беларусі - надання роднай мове статуса пануючай у дзяржаве. Вельмі балючай для яго з'яўляецца праблема білінгвізму. Пытанне аб суіснаванні ў беларускім грамадстве дзвюх моў у якасці дзяржаўных Н. Гілевіч вырашае вельмі катэгарычна, рашуча ставіцца за падтрымку роднай мовы, нават калі для гэтага трэба на нейкі час забараніць рускую, матывуючы сваю пазіцыю тым, што менавіта беларуская мова амаль заўсёды на працягу свайго існавання заставалася ў статусе занядбанай, пакрыўджанай і зараз апынулася перад рэальнай пагрозай знікнення з грамадскага жыцця дзяржавы. Тэму нацыянальнага суверэнітэту ў сваёй творчасці Н. Гілевіч таксама падае праз прызму моўнага пытання (Гілевіч  1993).

Публіцыстычнасць мастацкай прозы В. Быкава апошніх гадоў неаднаразова заўважалі крытыкі. Аднак менавіта ў пасляперабудовачны перыяд В. Быкаў амаль поўнасцю пераключаецца на публіцыстыку, у якой галоўным накірункам становяцца пытанні нацыянальнага адраджэння, усталявання суверэнітэту і заваёвы дэмакратыі, захавання роднай беларускай мовы, абуджэння гістарычнай свядомасці народа і раскрыцця праўды, схаванай дагэтуль у архівах КДБ (публіцыстычныя зборнікі "На крыжах" 1992, "Крыжовы шлях" 1998). У артыкулах, прысвечаных пытанням білінгвізму ("Мэта і сродкі"), В. Быкаў выказвае пункт гледжання, блізкі да пазіцыі Н. Гілевіча, прасочвае сувязь паміж суверэннасцю мовы І суверэннасцю нацыі, існаванне якіх адно без другога немагчыма. Моўны вэрхал, на яго думку, больш шкодны для Беларусі, чым забарона адной з моў.

Абвостраная і рэзка крытычная публіцыстыка В. Быкава часам падаецца чытачам занадта жорсткай, палітызаванай і гіпербалізаванай, а таксама песімістычнай. В. Быкаў вылучае ў бальшавізме шмат адмоўнага, але не бачыць светлага выйсця для беларусаў і ў сучасных гістарычных абставінах. Публіцыстыка В. Быкава гэтага перыяду амаль заўсёды скіраваная на балючыя кропкі ў гісторыі і сучаснасці Айчыны (Быкаў 1992).

Названыя публіцыстычныя серыі, якія выходзілі на Беларусі ў адзін са складанейшых перыядаў яе развіцця, яскрава адлюстроўвалі супярэчнасці эпохі. На

жаль, у сярэдзіне 1990-х гг. з-за фінансавых цяжкасцей выдавецтвы спынілі выпуск кніг публіцыстыкі, і па сённяшні дзень яны застаюцца амаль адзіным прыкладам менавіта комплексная асваення грамадска-эканамічных і сацыяльна-культурных, маральна-этычных праблем рэчаіснасці.

Публіцыстыка пазначанага перыяду з'яўляецца цікавым аб'ектам для паглыбленага навуковага даследавання. У 1980-1990-я гг. перад беларусамі паўсталі праблемы вызначэння накірунку эканамічнага, палітычнага, культурнага развіцця краіны. Публіцыстыка часоў перабудовы тэматычна і жанрава-стылёва разнастайная, што абумоўлена супярэчнасцямі, якія існавалі ў самім грамадстве. Але ў публіцыстыцы канца XX ст. усё ж можна вылучыць такія галоўныя тэмы, як экалагічная, нацыянальна-адраджэнская, вытворчая, вясковая. Апошняя, дарэчы, з'яўлялася вядучай для беларускіх аўтараў амаль заўсёды, і толькі на пачатку 1990-х гг. яна саступае першынства іншым тэмам. Мастацкая нарысістыка, дакументалістыка, мемуарныя творы гэтага перыяду - яскравы прыклад усведамлення пісьменнікамі сацыяльнай і духоўнай адказнасці за лёс краіны і грамадства, сведчанне грамадзянскай актыўнасці, імкнення выкрыць "белыя плямы" гісторыі і ўплываць на выбар далейшага шляху беларускай дзяржавы. Публіцыстыка 1980-1990-х гг. рыхтавала ў грамадстве глебу для далейшых дэмакратычных перамен і акрэслівала галоўныя тэмы і ідэі ў журналісцкай і пісьменніцкай творчасці пачатку XXI ст. Такім чынам, адзін з накірункаў далейшай распрацоўкі навуковай тэмы - даследаванне пераемнасці традыцый публіцыстыкі перыяду перабудовы і сучасных дзён.


ЛІТАРАТУРА

Быкаў В. На крыжах: Выступлении, артыкулы, інтэрв'ю. Мн., 1992.
Плевіч Н. Выбар. Мн., 1993.
Дуброўскі І. Не толькі разведка, але і бой // ЛІМ. 18.11.77.
Лысенка А. На шляхуабнаўлення// ЛІМ. 21.04.89.
Лысенка А. На хвалі сучаснасці// ЛІМ. 3.06.77.
Стральцоў Б. В. Человек во времени // Неман. 1981. № 2. С. 51.
Пярэдні край літаратуры // ЛІМ. 2.04.82.
Якавенка В. Вясковыядыспуты. Мн., 1987.


Пастуліў у рэдакцыю 06.10.05.

***Наталля Вячаславаўна Нарынкевіч*** - аспірантка кафедры перыядычнага друку. Навуковы кіраўнік - доктар філалагічных навук, прафесар Т.М. Дасаева.

*Т.А. ЛУЙГАС*

## СТАНОВЛЕНИЕ БЕЛОРУССКОЙ ПЕЧАТИ ДЛЯ ДЕТЕЙ И ПОДРОСТКОВ

Показано, что зарождение и развитие печати для детей и подростков на Беларуси в XX в. проходило в тесной связи с историей формирования государственности. Анализируются процессы возникновения журналов и газет на территории Советской и Западной Беларуси. Отмечена роль частных изданий для подрастающего поколения на современном этапе.

The article shows that the origin and the development of the press for children and teens in Belarus in the twentieth century were closely connected with the history of the state formation. The process of magazines and newspapers foundation on the territory of the Soviet and Western Belarus is being analized. There mentioned the importance of public editions for growing generation at the modern stage.

В настоящее время информационное поле Беларуси включает в себя около полутора тысяч периодических изданий и двухсот телерадиопрограмм (Журналістыка - 2003 2003, 3). Особую нишу в современной системе СМИ занимает белорусская детская и юношеская печать. Несмотря на то, что ее история насчитывает более полувека, научных работ, посвященных исследованию этой темы, нет.

Зарождение печати для детей и подростков на Беларуси проходило в непростых условиях. Внутриполитическую жизнь Российской империи на рубеже XIX-XX вв., в состав которой входили белорусские земли, отмечают глубокие идеологические и экономические преобразования, связанные с формированием